**Л.А. Глебава**

УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імені І.П. Шамякіна»

**ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ПЕРШАПАЧАТКОВАГА АДБОРУ ДЗЯЦЕЙ У ВАЛЕЙБОЛЕ**

Жаданы ўзровень майстэрства каманд вышэйшай лігі ў многім абуслоўлены адборам і пастраеннем педагагічнага працэсу ў юных валейбалістаў. Найболшьш актуальнай для трэнераў застаецца праблема адбору дзяцей на пачатковым этапе спартыўнай падрыхтоўкі. Рашэнне гэтай праблемы магчыма толькі пры творчым падыходзе трэнера да гэтага працэсу.

Падрыхтоўка валейбаліста – працэс шматгадовы. Пачынаць яя трэба з 10-12 гадоў, у праціўным выпадку губляецца асноўны сэнс падрыхтоўкі. У гэтых умовах першаступеннае значэнне набываюць глыбокае вывучэнне індывідуальных асаблівасцей спарцменаў і разработка рацыянальнай методыкі адбору для заняткаў валейболам. Асабліва вострая праблема выяўлення здольнасцей к спартыўнай дзейнасці ў дзяцей 10-12 гадоў. Юны спарцмен павінен быць ацэнены як складаная асоба з яе жаданнямі і патрэбнасцямі, якія часам спалучаюцца, а часам вельмі адрозніваюцца, таму работа па спартыўнай арыентацыі школьнікаў мае больш шырокае значэнне. Простым павелічэннем колькасці выканання тэхнічных прыёмаў і працягласці гульні зараз вялікіх вынікаў дасягнуць не магчыма. Заклад паспяховай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падрыхтоўкі валейбалістаў – умелы і правільны адбор дзяцей для заняткаў валейболам у ДЮСШ, а таксама ўлік іх узроставых псіхічных асаблівасцей у гэтым працэссе. Дасканалае авалодванне навыкамі гульні ў валейбол у мнегім залежыць ад узроўня развіцця здольнасцей (як агульных, так і спецыяльных).

Правільнае камплектаванне і першапачатковы адбор дзяцей для заняткаў валейболам у ДЮСШ з’яўляецца адной з вырашальных умоў, гаратнтуючых паспяховасць падрыхтоўкі юных валейбалістаў і папаўненне рэзерва каманд майстроў. Першапачатковы адбор залежыць ад мнагалікіх фактараў, вызначаючых жаданні юнага спарцмена займацца пэўным відам спорта. Часцей за ўсё размова ідзе аб адначасовым і ўзаемным дзеянні многіх фактараў, сярод якіх неабходна адзначыць:

- даступнасць спартыўнага аб’екта (пляцоўкі, зала);
- лёгкасць, з якой можна прыступіць да стварэння арганізаваннай каманды;
- вызначэнне патэнцыяла, таланта;
- схільнасць да выбранага віду спорта;
- больш ці менш накіраваныя ўплывы (якія залежаць ад акружаючых: сваякоў, равеснікаў, спецыялістаў,што настойліва раяць займацца валейболам высокім хлопчыкам і дзяўчынкам).

Больш шырокае спляценне фактараў, якія ўплываюць на выбар віда спорта, само па сабе ўказвае на магчымасці мнагалікіх промахаў, паколькі існуе няўзгодненасць паміж разнастайнымі фактарамі, напрыклад няўзгодненнасць псіхафізічнага патэнцыяла са схільнасцю да віду спорта і непрыняцце пэўнай спартыўнай групы.

Пры першапачатковым жаданні займацца пэўным відам спорту, безумоўна, вырашальнымі з’яўляюцца эмацыянальныя фактары, якія характэрызуюцца спантаннасцю і свабодай выбара. Далейшы ход заняткаў спортам, як мы ведаем, у меньшай ступені афарбаваны спантаннасцю, свабодай і здавальненнем выключна эмацыянальных патрэб. Усё большае значэнне набываюць рацыянальна вызначаныя фактары, спрыяючыя фарміраванню звычак, патрэб і абавязкаў займацца безперапынна і сістэматычна, вучыцца і ўдасканальвацца.

Фактары, што вызначаюць спартыўную арыентацыю юнай асобы, самі па сабе ўказваюць на тое, што трэнер як спецыяліст па адбору рашае вельмі складаныя і тонкія задачы са сваім спартыўна-педагагічным і псіхолага-сацыялагічным аспектам. Дастаткова высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі трэнера перашкаджае промахам, да ліку якіх можна аднесці, напрыклад, адзнакі на аснове толькі фізічных якасцей, ці на патэнцыяльных магчымасцях навічка.

Паспяховасць заняткаў валейболам і дасягненне высокіх спартыўных выннікаў залежыць ад устойлівага інтарэсу да заняткаў, валявых якасцей, працалюбівасці, напорства, сдольнасцей да спартыўнай дзейнасці з улікам спецыфічнасці валейболу, узроўня спецыяльных якасцей, навыкаў, уменняў і ведаў у валейболе.

У апошнія часы ў валейболе вельмі важнай праблемай становіцца камплектаванне каманд. Сучасны ўзровень развіцця гульні прад’яўляе да ігракоў высокія патрабаванні – наяўнасць універсальнасці ў падрыхтоўцы, высокі ўзровень выканання сваёй гульнёвай функцыі ў камандзе, вышэй сярэдняга раставыя даныя, атлетычная падрыхтоўка. Для дзіцячых і юнацкіх валейбольных каманд характэрным з’яўляецца разнастайны па ўзроўню падрыхтоўкі і антрапаметрычным данным састаў ігракоў. Вось чаму зараз асабліва актуальна задача адбору дзяцей для заняткаў валейболам. Ад яе рашэння ў многім залежыць падрыхтоўка каманд валейбалістаў высокага класу.

Адбор уключае некалькі этапаў:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1. На гэтым этапе праводзіцца вялікая агітацыйная работа, з мэтай выявіць інтарэс у школьнікаў да заняткаў валейболам; усе вучні, што жадаюць займацца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

валейболам у ДЮСШ,падвяргаюцца стараннаму вывучэнню і медзіцынскаму кантролю.

2. Гэты этап найбольшскладаны і адказны. На гэтым этапе з дапамогай сістэмытэстаў і спецыяльных наблюдзенняў атрымоўваюць данныя па якім можна меркаваць аб задатках і магчымасцях дзяцей да паспяховага авалодвання навыкамі і ўменнямі гульні ў валейбол. Да гэтых данных адносяцца: узровень развіцця фізічных якасцей, прымяняльна да спецыфікі валейбалістаў, здольнасць да авалодвання тэхнікай (спецыфічныя каардынацыйныя здольнасці), антрапаметрычныя данныя.

Усе паказчыкі падзяляюцца па іх значымасці для першапачатковага авалодвання спецыяльнымі навыкамі і ўменнямі гульні і дасягнення высокай ступені дасканаласці ў гэтых навыках і ўменнях. На гэтым этапе паслядоўна выяўляюцца задаткі здольнасцей, атрыманыя пры нараджэнні, анатама-фізіялагічныя асаблівасці арганізму і яго функцыянальныя магчымасці, прымяняльна да валейболу.

3. У поўнай меры судзіць аб здольнасцях дзяцей да валейболу можна толькі пачаўшы іх вучыць спецыяльным навыкам і ўменням. Асноўным паказчыкам тут будзе тое, як хутка вучні авалодваюць тэхнікай і тактыкай гульні, іх адносіны да заняткаў, працалюбівасць і г.д. Гэта самы працяглы этап, ен можа доўжыцца ад 6 месяцаў да 1 года.

4. Калі на першых трох этапах выявіліся здольнасці да валейболу як віду спорта, то ў далейшым адбор вядзецца ў плане вызначэння іх гульнёвай спецыялізацыі, найбольш эфектыўнага выкарыстання індывідуальных здольнасцей у саставе каманды і г.д.

Праблема вызначэння здольнасцей у сілу сваёй складанасці не абмяжоўваецца комплексам пералічаных паказчыкаў, яна ўключае глыбокае вывучэнне дзіцяці, яго роста і развіцця на папярэдніх этапах, вялікае значэнне мае фактар спадчыннасці, валявая сфера і інш.

Падкрэсліваючы вядучую ролю генетычна абумоўленых фактараў пры адборы (рост, тэмперамент) у той жа час неабходна адзначыць, што «генетычны падмурак дае толькі межы, ён толькі лімітуе пэўныя якасці, тады як трэніравальны аспект з'яўляецца вырашальным фактарам іх праяўлення і ўдасканалення». Гэта кропка гледжання прынцыпова важная. Яна паказвае што сам адбор – толькі абавязковая складовая частка трэніровачнага працэсу і з дапамогай упартай і прафесійнай работай магчыма дасягнуць выдатных вынікаў і ў менш таленавітых спарцменаў.

З усяго вышэй выкладзенага можна зрабіць выснову, што задача адбора асабліва актуальная, таму як першапачатковы адбор дзяцей і правільнае камплектаванне груп для заняткаў валейболам у ДЮСШ з’яўлецца адной з вырашальных умоў, гарантуючых паспяховасць падрыхтоўкі юных валейбалістаў і папаўненне рэзерва каманд больш высокага класу гульні.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ